Георгій Марчук

# Прыгоды ката Фокуса



Георгій Марчук

# Прыгоды ката Фокуса

КАЗКІ



Мінск
«Мастацкая літаратура»
2022

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
М30

Ілюстрацыі *Віталя Дударэнкі*

Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе
і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**ISBN 978-985-02-1534-5**

© Марчук Г. В., 2022
© Дударэнка В. В., ілюстрацыі, 2022
© Афармленне. УП «Мастацкая літаратура», 2022



# ПРЫГОДЫ КАТА ФОКУСА

## ЯК АГАПКА МАЛЬВУ ЎРАТАВАЛА

Вось што здарылася аднойчы ў маленькай вёсачцы Крынічкі. Быў май. Дзесяцігадовая кірпатая, з доўгай густой касой дзяўчынка Агапка гасцявала ў сваіх дзядулі і бабулі. Агапчыны бацькі — смелыя і шчырыя людзі, што працавалі выратавальнікамі,— накіраваліся ў далёкую краіну Грэцыю, каб гасіць лясныя пажары. Агапка любіла вёску, і ёй там было цікава. А яшчэ ва ўтульным доме бабулі і дзядулі была печ, у якой бабуля рабіла смачныя пышныя бліны і варыла прасяную кашу. А яшчэ бабуля навучыла Агапку даіць казу Марфу. Часцяком да іх увечары прыходзіў суседскі кот Фокус, каб пачаставацца малаком. У Фокуса была гаспадыня — адзінокая старая, якая чытала газету, трымаючы ў руках вялізную лупу. Яны не мелі ні каровы, ні казы, ні качак, ні гусей. Кот меў здольнасць

дэманстраваць розныя фокусы, таму і мянушку яму далі — Фокус. Скокне, здаралася, на акно, а за імгненне вылезе ўжо праз комін на страху. Ці вытыркне праз шчыліну ў плоце свой шыкоўны хвост і пачынае ім круціць, палохаць галубоў ды вераб'ёў. Меў Фокус адну незвычайную мару: трапіць у той горад, дзе жыве Агапка. Ён жа далей за сваю вёску нідзе не быў. Нават на другі канец адной-адзінай вуліцы не хадзіў — баяўся. Там жыў пануры і заўсёды ўсім незадаволены былы вартаўнік малочнай фермы Піліп Барабанадуля. У двары ягонага дома бегаў на доўгім ланцугу гэткі ж злосны, як і гаспадар, сабака Пірат. Барабанадуля нават не вітаўся з Агапчынымі бабуляй і дзядулем, калі ехаў на ровары паўз іхні дом. Ён майстраваў клеткі для птушак, прылады розныя, каб лавіць мышэй ці птушак, і вазіў іх на кірмаш — прадаваў. Ён быў малы, заўсёды насіў чорны капялюш. Востры нос, як у каршуна дзюба, ды густыя чорныя вусы рабілі яго яшчэ больш панурым і насцярожаным. «Мне не зманіш. Старога вераб'я на мякіне не ашукаеш. Я вас усіх добра ведаю»,— заўсёды казаў ён адно і тое, калі сустракаў людзей. Ён

і Пірата свайго амаль не карміў, каб той быў зусім злосны.

Агапчын дзядуля быў мастаком. Ён маляваў гэткія прыгожыя кветкі, што проста дзіва. Усе нібыта жывыя — і півоні, і шпажнікі, і браткі, і лілеі. Проста вачэй не адвесці ад яго карцін, прыгажосць такая. Не было на дзядулевых карцінах толькі адной кветкі — мальвы. Адна на ўсю вёску мальва расла якраз пад плотам Барабанадулі. Ды вось гора, не мог дзядуля выправіцца ў такі далёкі шлях: хвароба не дазваляла. З цяжкасцю ён соваўся па хаце ды часам у цёплы сонечны дзень выходзіў на падворак, каб пакарміць з рукі курак. Агапка ведала, што дзядуля хоча намаляваць мальву, бо кветка гэта была для яго дарагая — яе вельмі любіла ягоная мама.

Прачула аднойчы Агапка — кот Фокус цішком паведаміў,— што Барабанадуля намерыўся новы плот вакол сваёй сядзібы майстраваць і ўжо прывёз першую партыю жалезабетонных слупоў. Агапка адважылася, наблізілася да Пілі-павай сядзібы. Пірат гучна забрахаў на ўсю ваколіцу, пагрозліва выставіў іклы, тузаў ланцуг, скакаў ля плота. Агапка заўважыла, што жале-

забетонны слуп амаль прыціснуў мальву, якая добра расла, выкінула ўжо зялёныя лісцікі.

Тады і вырашыла Агапка ўратаваць мальву: выкапаць яе таемна і пасадзіць ля свайго дома. «Гэта будзе падарунак да дня нараджэння дзядулі»,— падумала яна. Агапка разумела, што адна яна гэтага не зробіць, і пачала ўгаворваць ката Фокуса дапамагчы.

— Хе, а як я табе дапамагу? — здзівіўся Фокус, чухаючы лапай вуха.

— Ты будзеш адцягваць увагу Пірата на супрацьлеглым баку дома, а я тым часам хуценька выкапаю кветку,— агучыла свой план Агапка.

— Вось яшчэ! Ды ён мяне пашкуматае толькі так,— не на жарт спалохаўся Фокус.

— Ты зможаш! Ты ж фокуснік! Хвост прасунеш у шчыліну... Пірат кінецца да яго, а ты — маланкай на плот... Ён у дурнях і застанецца.

— Хе, Піліп можа на суд падаць. Скажа, мальву ў яго скралі, плаці грошы,— насцярожыўся Фокус.

— Не падасць. Гэта не яго мальва. Яна на вуліцы расце. Яна агульная... Яна ў яго за пустазелле. Плотам прыцісне яе і знішчыць,— пераконвала Фокуса Агапка.

— Ну добра. Што я за гэта буду мецЬ? — прымружваючы свае хітрыя зялёныя вочкі, спытаў Фокус.

— Прасі што хочаш.

— Хе, мне грошы трэба.

— А навошта табе грошы? У вёсцы ж і крамы няма. Шэсць хат на адзін бок вуліцы ды чатыры на другі.

— Я ў горад хачу. Мне грошы трэба. У горадзе ж без грошай ніяк нельга,— даводзіў кот.

— Ну добра, дамовіліся. Я цябе ў горад і без грошай адвязу. З маімі бацькамі на машыне паедзем,— паабяцала Агапка.

— Хе. А назад як? — абачліва спытаў Фокус.

— І назад зможам адвезці. Згодны?

— Згодны.

Дачакаліся яны, калі Барабанадуля зноў паехаў па слупы, узялі рыдлёўку і хуценька накіраваліся да сядзібы панурага суседа. Скокнуў Фокус на падворак з боку сада і пачаў надакучліва мяўкаць. Пірат як ракета адразу ж кінуўся да парушальніка мяжы. Гэтага і чакала Агапка. Яна хуценька пачала выкопваць

мальву. Але хутка не атрымлівалася. Карані кветкі былі глыбока пад зямлёй, і дзяўчынка з цяжкасцю выцягвала іх. Балелі рукі, трэсліся ногі, але Агапка працягвала капаць.

А тым часам, шалеючы ад злосці, Пірат лавіў Фокуса. Трэба сказаць, што Фокус ужо добра стаміўся і не на жарт спалохаўся, бо Пірата падчас сваёй адсутнасці гаспадар здымаў з ланцуга, і сабака бегаў, дзе хацеў. Фокус трымаўся з апошніх сіл. Плот быў невысокі, Пірат падскокваў, і жахлівыя сківіцы сабакі ляскалі ля самага Фокусавага вуха. Вырашыў кот апошнім разам пацвяліць Пірата і высунуў свой хвост у шчыліну. Аднак трохі прамарудзіў і раптам узвыў немым голасам ад болю: Пірат усё ж здолеў адгрызці кончык хваста. Сплываючы крывёю, кот аднак застаўся ля плота, па-ранейшаму адцягваючы ўвагу Пірата. Усё было зроблена належным чынам. Агапка загарнула мальву ў цэлафанавы пакет і хуценька сышла. Дома яна пасадзіла кветку пад вокнамі дзядулевай майстэрні.

Прывёз Барабанадуля слупы для плота і выгрузіў іх акурат на тое месца, дзе расла мальва. Не жыць бы ёй, калі б не Агапка. Фокус

схаваўся ў гумне, залізваючы рану. Агапка адшукала яго, падзякавала за смеласць.

— Дзякуй я на сала не намажу... Каму я цяпер патрэбны з адгрызеным хвастом,— бедаваў Фокус,— смех дый годзе. На вочы гаспадыні сорамна трапляць. Я лупу пакуль схаваў, каб яна не заўважыла. І навошта я пагадзіўся на гэткую авантуру?

— Пабойся бога, Фокус, ты мальву ўратаваў. Я адна не змагла б гэтага зрабіць. У горад паедзем абавязкова! — упэўнена сказала Агапка.

— Пратэз заказваць, ці што? — сумна адгукнуўся Фокус.

— Усё будзе добра. Праз тыдзень і паедзем. Мне эсэмэску даслалі... бацькі вылятаюць праз тыдзень.

Слова сваё Агапка стрымала. Прыехалі яны ў сталіцу, а там якраз выстава знакамітых пародзістых катоў ды сабак. З цяжкасцю, але ўгаварыла Агапка Фокуса наведаць выставу.

— Што мне там рабіць? Там жа ўсе пародзістыя: англійскія, сібірскія, чаротавыя, тыгровыя,— скардзіўся Фокус.

— Ты нічога не разумееш. Ты будзеш зоркай першай велічыні.

— А парода?

— Парода? Парода — крынічны герой. Хай усе зайздросцяць,— адказала Агапка.

І сапраўды... На выставе, дзе Агапка прымацавала шыльдачку «Фокус, крынічны герой», сабралася больш за ўсё дзяўчынак і хлопчыкаў і іхніх бацькоў.

Агапка ахвотна расказвала ўсім пра подзвігі адважнага Фокуса. Усе дзякавалі Фокусу і пляскалі ў ладкі.

Вярнуўся кот на вёску і яшчэ доўга апавядаў сваёй гаспадыні пра падарожжа ў сталіцу, пра новыя прыгожыя будынкі, пры выставу. У сярэдзіне лета расквітнелі вялікія цёмна-малінавыя кветкі мальвы, на прыгажосць якой дзівіліся і бабуля з дзядулем, і Агапка з бацькамі, і Фокус са сваёй гаспадыняй, якая прыйшла, як заўсёды, з лупай, каб лепей бачыць прыгажосць мальвы. І ўсім было добра і хораша ад прыгажосці свету.

## ЯК КОТ ФОКУС ІЛЬВОМ БЫЎ

Вось да чаго часам зайздрасць давесці можа. Прызвычаіўся кот Фокус у доўгія зімовыя вечары са сваёй гаспадыняй да самай ночы тэлевізар глядзець. Асабліва захапляліся яны перадачамі пра падарожжы ў розныя краіны: падабаліся ім пінгвіны ў Антарктыдзе, страусы ў Аўстраліі, ільвы ў Афрыцы.

— Глядзі, бабка Міла, бліжэй лупу да экрана... во якія ў мяне сваякі,— выхваляўся Фокус і паказваў лапай ільвоў на экране.— Пірат, бадай што, і не ведае, якая ў мяне абарона. А я тутака ў холадзе мышэй вымушаны палохаць,— наракаў на свой лёс Фокус, зайздросцячы львам.

Аднойчы Фокус глядзеў мульцік і раптам убачыў паласатага ката. Той гойсаў у цяльняшцы, нібы марак. І надумаўся Фокус перафарбавацца

ў другі колер, зрабіцца вясковым ільвом, гразой усяго наваколля.

— Не жадаю больш мець аднолькавы колер з мышамі,— сказаў ён сам сабе.

Зноў надышлі цёплыя летнія дні, і Фокус выправіўся да суседа-мастака, каб папрасіць фарбу.

Звычайна па абедзе мастак адпачываў, і Фокуса ласкава сустрэла жонка мастака, бабуля Агапкі.

Фокус, трэба сказаць, быў добрым хітраванам. Вырашыў да часу свой план не раскрываць: хай лепш пасля ўсе здзівяцца, калі ўбачаць яго львіны нораў.

— Я вось... фарбу хацеў у вас папрасіць... пазычыць. Мы пенсію атрымалі, я вам грошай, колькі трэба, дам,— асцярожна пачаў свае размовы Фокус.

— А якую табе фарбу трэба? І навошта? — пацікавілася Агапчына бабуля.

— Жоўтую. Мне трэба гэта... акно наша пафарбаваць. Аблезла старая фарба,— схітрыў Фокус.

— Добра. Ды вось неспадзяванка: нешта я жоўтую і адшукаць не магу. Я ў іх не разбіраюся. Прыходзь увечары, запытаем гаспадара.



— Не. Цяпер трэба.

Фокус баяўся, што мастак можа і не даць яму фарбу.

— Ну добра. Вось табе фарбы, выбірай,— згадзілася Агапчына бабуля.

Фокус не марудзячы схапіў тры цюбікі зялёнай фарбы. Кацінья меркаванні былі такія: калі зялёным колерам пафарбаваць яго шэрую поўсць, дык абавязкова атрымаецца карычневая, як у льва.

Прыбег Фокус дахаты, выціснуў фарбу ў міску, усё паразмешваў і пачаў качацца ў місцы, як часам качаўся на вуліцы. Пасля гэткай працэдуры зірнуў на сябе ў люстэрка і вохнуў. Цяльняшкі не атрымалася, не атрымалася і жоўта-карычневага колеру, а зрабіўся ён увесь зялёны як жаба. Схаваў на ўсялякі выпадак ад гаспадыні лупу, каб яна не ўбачыла яго новую «вопратку». А сам падумаў: усё ж гэта лепш, чым звычайны шэры.



Супакоіў сябе кот і наважыўся франтам прайсціся па вуліцы. Куры, як угледзелі гэтага незнаёмага зялёнага цмока, разбегліся ў розныя бакі, вераб'і паразляталіся, варона скочыла на плот.

— Зноў у горад збіраешся? Зноў на выставу апрануўся? — асцярожна пацікавілася варона.

— А як жа. Гэта мой натуральны колер, як у маіх сваякоў з Афрыкі,— выхваляўся Фокус.

— А я падумала, што гэта табе строй жабы падаравалі. Дзе ты бачыў зялёных ільвоў? — пыталася варона.

Фокус нічога ёй не адказаў і рушыў далей па вуліцы.

— Спыніся, пудзіла, ты хто? — закрычаў на яго сабака Пірат.

— Хіба не пазнаеш? Я Фокус, блізкі сваяк афрыканскіх ільвоў,— смела адказаў Фокус.

— Прэч адсюль, не палохай майго гаспадара, пудзіла ты з балота, а то яму сасняцца страшныя сны. Я табе хвост адгрыз, дык яшчэ і вуха адгрызу,— прыстрашыў Пірат.

— Хто там? — спытаў Барабанадуля, выходзячы на ганак.

— Фокус. Блазан наш вясковы. Прыйшоў нас палохаць,— адказаў Пірат.

— Які ён Фокус. Ён куртаты, хе. Ідзі далей, жаба балотная. А не, дык напішу ў сельсавет і цябе выселяць адгэтуль, мафіёзу,— паабяцаў Барабанадуля.

Засмучаны Фокус вярнуўся дамоў. Гаспадыня тым часам адшукала лупу, прыгледзелася і спалохалася.

— Ты хто? Ты чый?

— Ды гэта я... Фокус.

— Які Фокус? Ты не падобны на Фокуса. Згінь з вачэй, прападзі, нячыстая сіла, цьфу, цьфу, цьфу! — І яна тройчы перажагналася.

— Пафарбаваўся я,— вінаватым голасам сказаў Фокус.

— Не мой ты кот... і ўсё тут. Згінь,— даводзіла сваё бабулька.

Залез Фокус на гарышча і засумаваў, вельмі засумаваў.

Усе паднялі яго на смех, а гаспадыня — дык тая і зусім не пазнала. Так у самоце і застаўся Фокус на гарышчы, так і ноч мінула — цёплая, летняя. А раніцай зірнуў кот у акно і ўзрадаваўся. Да дзядулі і бабулі на канікулы

прыехала Агапка. Фокус адразу ж праз гароды паспяшаўся да дзяўчынкі па параду. Спачатку і Агапка не пазнала яго.

— Ну ты ж мяне і напалохаў, Фокус,— сказала яна.

— Ды я ўжо і сам не рады. Хацеў адзін раз у жыцці зрабіцца львом,— скрушліва адказаў Фокус,— перастараўся.

— А фарбы дзе ўзяў?

— У вас. Як мне зноў шэрым стаць, парай,— пачаў прасіць Фокус.

— Пакажы мне, якую ты фарбу браў і дзе? — спытала Агапка.

І Фокус паказаў на цюбікі. Агапка з палёгкай уздыхнула.

— Табе, Фокус, пашанцавала. Гэта акварэльныя фарбы, бо калі б ты пафарбаваўся алейнымі фарбамі, давялося б цябе да доктара везці, і яшчэ невядома, чым бы ўсё завяршылася.

Пасадзіла Агапка Фокуса ў ночвы, прынесла цёплай вады, дадала шампуню і хуценька адмыла зялёную фарбу. Ажно настрой палепшыўся ў Фокуса.

— Прасі што хочаш! У мяне і грошы ёсць,— сказаў Фокус.

— Ды нічога мне не трэба, мы ж сябры.

— Сябры,— пацвердзіў Фокус.

— Значыцца, павінны дапамагаць адно аднаму бясплатна. Згодны?

— Згодны. А Барабанадуля кажа, што нічога бясплатнага няма, за ўсё трэба плаціць.

— А ты менш слухай яго. Жыві сваім розумам, як вучыць мяне бабуля,— сказала Агапка.

Пабег Фокус як найхутчэй дамоў. Гаспадыня яго ўжо з ног збілася: шукала і ў склепе, і ў хляве, і ў гародзе, і ў садзе была, і на гарышча зазірала, а Фокус як у ваду кануў. Хоць ты плач. А тут раптам ён і сам з'явіўся.

— Ну, дзякуй богу,— узрадавалася гаспадыня і тройчы перажагналася.— А то, бач ты, учора нейкае пудзіла з'явілася і дзяўбе, што яно Фокус. Я да смерці напалохалася.

Фокус, безумоўна, не расказваў старой, як ён зялёным ільвом быў. Не хацеў засмучаць гаспадыню, якую за яе дабрыню і працавітасць вельмі паважаў, шанаваў і шкадаваў.

І зажылі яны, як і раней,— у міры і згодзе.

## ПАРАДА – ДОБРА, А СВОЙ РОЗУМ – ЛЕПШ

Зусім пагоршыўся зрок у бабулі Мілы, Фокусавай гаспадыні. Яна трымала лупу перад вачыма, але ўсе роўна з цяжкасцю чытала свае любімыя газеты і часопісы пра прыроду, космас і розных зверанят. Гэта заўважылі Агапка і яе бабуля, калі прынеслі суседзям пачастунак — смачныя, сакавітыя грушы.

— Ты, суседачка мая даражэнькая, да доктара звярнулася б. Кажуць, у сталіцы на вачах аперацыі робяць,— раіла Агапчына бабуля.

— Ды дзе ж мне грошай на аперацыю ўзяць? Барабанадуля гаварыў, што багатыя ў сталіцы ўжо за ўсё грошы патрабуюць,— адказвала засмучаная гаспадыня Фокуса.

— А сын твой дзе? Хай пра грошы для роднай маці паруліцца,— узгадала Агапчына бабуля.

— Ён далёка. Дзесьці ля Ціхага акіяна... за светам. Ужо і лістоў увесь год не дасылае... можа, ён там без працы,— абараніла старая Міла сына.

— Так і зусім зрок страціць можна. Гэта хвароба называецца катарактай,— далучылася да размовы і Агапка.

— А я пра што? — ажывіўся Фокус.— Што я тады з ёю рабіць буду?

— Пакуль, дзякуй богу, вочы трошкі бачаць. Я іх штораніцу вадой з крынічкі прамываю... чарніцы ем, нібыта лепей робіцца,— супакоіла ўсіх старэнькая Міла.

Запомніў Фокус словы пра грошы на аперацыю і вырашыў самастойна іх зарабіць, каб ніхто не ведаў. Зрабіць сваёй гаспадыні сюрпрыз. І выправіўся па параду не да Агапкі, а да Барабанадулі.

— І колькі ж табе грошай трэба? — пагардліва спытаў Барабанадуля.

— Я па тэлебачанні рэкламу гэтай клінікі бачыў... 500 долараў амерыканскіх трэба,— ціха адказаў Фокус.

— Гэта вельмі вялікія грошы для вёскі.

— Я магу адпрацаваць. Усё зраблю. Загадвайце... што трэба? — зацікавіўся Фокус.

— Усё, кажаш? Хе... Гэта добра. Мне твой спрыт падабаецца. У вас на гарышчы ластаўка гнёздо зладзіла.

— Так. Штовесну прылятае,— з гонарам адказаў Фокус.

— Хе. Вось табе сетка і клетка. Ты птушаня маленькае, якое толькі-толькі лётаць пачынае, злаві і мне прынясі... вось тады і атрымаеш грошы,— прапанаваў Барабанадуля.

— А вы не падманеце? — рызыкнуў спытаць Фокус.

— Я? Ды ніколі.

— Вы ж казалі, што цяпер усё на падмане і грашах трымаецца,— узгадаў Піліпавы словы Фокус.

— Дык тое ў горадзе. А я слова сваё купецкае трымаю. Бяры сетку ды клетку і дзейнічай.

Трэба сказаць, што птушкі не рабілі гнёздаў пад страхой Барабанадулевай хаты і ў яго садзе — баяліся. Ніколі ён не майстраваў дамкоў і для шпакоў. Ён птушак не любіў, а птушкі не любілі яго. Вясковая ж ластаўка штогод вярталася толькі на гарышча да старэнькай Мілы. Вось і сёлета з гнязда паказвалі свае чорнабелыя галоўкі тры птушаняты. Яны рыхтаваліся

да самастойнага палёту. Бацькі пакінулі ўжо гарышча.

Фокус стаіўся ля акенца і чакаў. Неўзабаве праляцелі зусім блізка ад ката два птушаняткі, а трэцяе, самае малое і кволае, затрымалася, замітусілася на гарышчы. Тут Фокус спрытна і накінуў на акенца сетку і зноў стаіўся. Памкнулася ластавачка да акенца і трапіла ў сетку. Фокус не марудзячы схапіў яе і пасадзіў у клетку. Так небарака ластавачка міжволі апынулася ў палоне. Спрабавала знайсці якую шчыліну, ды зусім знясілілася. Фокус накрыў анучкай клетку, каб ніхто нічога не заўважыў, і вырашыў раніцай аднесці птушку Барабанадулю.

Не дачакаўшыся свайго птушанятка, дружная і вясёлая сям'я ластавак захвалявалася і пачала актыўна яго шукаць. Ластаўкі пікіравалі ля вокнаў старэнькай Мілы, лёталі проста над яе галавой, гучна крычалі.

— Ды што гэта з імі? Быццам бы і ў вырай збіраліся, ды не адлятаюць. Быццам бы шукаюць каго,— зацікавілася бабуля Міла.

— А я адкуль ведаю. Можа, з'елі што дрэннае... жываты ў іх баляць. У мяне так бывае,— схлусіў Фокус.

Надвячоркам вярнуліся ластаўкі на гарышча, але знайсці накрытую клетку было немагчыма.

Раніцай усё паўтарылася. Ластаўкі не ляцелі на поўдзень, яшчэ гучней крычалі і лёталі па ўсёй вёсцы.

Западозрыла штосьці нядобрае і Агапка, вырашыла наведаць бабулю Мілу і ката Фокуса. Кот тым часам спалохаўся, што птушаня ў клетцы ляжыць і не рухаецца, і вырашыў пакарміць яго кавалачкам рыбы, які застаўся ад вячэры.

— Ты што тут робіш? Чыя гэта клетка? Адкуль тут ластаўка? — строга запытала Агапка, калі паднялася па лесвіцы на гарышча.

Падзецца не было куды, і спалоханы Фокус усё расказаў.

— Хоць бы са мной параіўся,— дакарала Агапка.

— Хацеў сюрпрыз зрабіць, грошы зарабіць і дапамагчы сваёй гаспадыні,— апусціў пыску ўніз і панура адказваў Фокус.

— Ластаўкі ў палоне не жывуць, гэта, па-першае, а па-другое, як вучыць мяне дзядуля: злом добрыя справы не робяцца, добрыя справы робяцца толькі дабром. Вынось клетку на двор і

адчыняй засаўку. Яшчэ б трошкі, і птушачка памерла б без ежы.

— Мама,— зусім спалохаўся Фокус.

— Вось табе і мама. Вынось.

Так і зрабілі. Ластаўкі адразу ж згледзелі свайго сваяка, прынеслі ў дзюбачках вады.

Птушачка акрыяла, махнула крылцамі і вылецела з клеткі. Пакружылася сям'я ластавак над домам, над калодзежам, над садам, над вёскай і адляцела ў вырай.

— І што цяпер рабіць? Грошай Барабанадуля не пазычае,— бедаваў Фокус.

— Знойдзем выйсце. Хадзем да дзядулі. Ён намалюе твой партрэт, мы паедзем у горад, прададзім партрэт і заробім грошай,— прапанавала кемлівая Агапка.

— Ага... Што я, зусім дурны, каб з адгрызеным хвастом пазіраваць? — насцярожыўся Фокус.— Смяяцца ж усе будуць.

— Дзядуля што-небудзь прыдумае. Замест хваста табе дзьмухавец намалюе,— жартавала Агапка.

Атрымаўся Фокус на партрэце выдатна — усім катам кот. Усе адзначылі: як жывы.

Кот пераканаўся, што на партрэце ён выглядае героем і прыгажуном, і наважыўся сам прадаваць

свой партрэт. Агапчын бацька адвёз іх на вернісаж.

Нейкі спагадлівы чалавек купіў партрэт, праўда, за палову цаны. Грошы, якіх не хапала, збіралі ўсёй вёскай. Унеслі сваю частку і бацькі Агапкі, далі і бабуля з дзядулем.

Спачатку старая Міла не згаджалася ехаць у сталіцу, баялася аперацыі, але яе ўгаварылі.

— Я буду побач. Я залезу на дрэва пад акном аперацыйнай,— супакойваў гаспадыню Фокус.

Усё, дзякуй богу, абышлося. Больш лупа бабулі Міле не спатрэбіцца. Як жа яна радавалася, што зноў добра бачыць прыгажосць навакольнай прыроды, і неба, і лес, і рэчку, і поле. Па дарозе дамоў нават песні старажытныя народныя спявала, хоць у апошнія гады ад яе ніхто песень не чуў. Агапка і Фокус і радыя былі б падпяваць ёй, але слоў не ведаюць. Бабуля Міла абяцала іх навучыць. І яна гэта зробіць, бо да пенсіі бабуля працавала настаўніцай спеваў у школе ў суседняй вёсцы.

## ЯК ПАМІРЫЛІСЯ МУХА І ФОКУС

Прыйшла ў вёсачку Крынічкі ранняя вясна. Сонейка, па якім за зіму засумавалі, радавала ўсіх. Выйшлі на ганак пагрэцца на сонейку кот Фокус і яго гаспадыня — бабуля Міла.

— Нешта даўно на нашым клёне шпакі не сяліліся,— сумна прамовіла бабуля.

— Шпакоўня старая. Працякае ўся. І шпакі цяпер разумныя, усе новыя шпакоўні шукаюць,— з веданнем справы зазначыў Фокус,— досыць і таго, што салоўка ў кустах спявае, а шпакі пад вокнамі толькі спаць раніцай не даюць,— дадаў ён.

— Не кажы. У іх свае песні, яны прыгожа спяваюць. Трэба было б для іх новую шпакоўню змайстраваць. Ды вось гора, няма каму.

— А я? — нават пакрыўдзіўся Фокус.

— Паспрабуй. Вось табе грошы. Купі ў суседа Барабанадулі дошак. А нажоўка, малаток і

цвікі ў нас у кладоўцы... ад мужа майго засталіся.

Схамянуўся Фокус і пачаў адгаворваць.

— Можа, не трэба нам гэтых шпакоў? Лепш на гэтыя грошы дыскі купім з гульнямі для камп'ютара. Крута будзе.

Ён ужо і не рады быў, што пагадзіўся, але не было куды падзецца.

Гэту размову падслухала вялікая зялёная Муха на мянушку Ракета. Яна не любіла прылятаць у двор да бабулі Мілы, бо заўсёды ганяўся за ёю гэты шкоднік — кот Фокус. Жыцця не даваў. Таму найчасцей гасцявала Муха ў Пірата, які дазваляў ёй разам з ім абедаць з адной міскі.

Пірат хцівы быў, як і гаспадар, ды паспрабуй не пачастуй куслівую назолу Муху, ратунку не будзе. І гудзе бесперастанку над вухам, і балюча за хвост кусае, і ў вочы лезе, спаць перашкаджае. Таму ён і зміры́ўся з дармаедкай. Затое жыццё зрабілася спакайнейшым. Муха і прынесла навіну пра тое, што Фокус наважыўся шпакоўню майстраваць. За гэту навіну Муху ўхваліў сам Барабанадуля.

— Трэба было б гэтага агіднага ката правучыць насамрэч. Каб яго, няўдаліцу, гаспадыня з двара прагнала,— прапанавала Муха.

— Паспрабуем,— пасміхнуўся заўсёды пануры і ўсім незадаволены Барабанадуля.

Купіў матэрыял для шпакоўні Фокус, а што з ім рабіць — не ведае.

— Вы мне намалюйце чарцяжы... Ну, як гэту рэч робяць,— папрасіў парады Фокус.

— Грошы давай,— сказала Муха, якая хацела дагадзіць Барабанадулю.

Выцягнуў апошнія медзякі Фокус і аддаў суседу, які і зрабіў яму чарцёж шпакоўні.

Задаволены і самаўпэўнены, Фокус порстка ўзяўся за справу.

— Цяпер і Муха да нас носа не ўторкне. Шпакі яе адразу ж глынуць,— думаў ён.

Да вечара справу зрабіў, узлез на клён і прыбіў шпакоўню замест старой, якая зусім развалілася.

Пачалі яны з бабуляй Мілай чакаць гасцей.

Адны ляцяць, другія, трэція, ды ўсё міма. Ужо ўсе тры шпакоўні ў суседа-мастака, Агапчынага дзядулі, шпакі пазаймалі, а клён ля дома бабулі Мілы абмінаюць.


ПЛАН



— І дзе твае шпакі, гора-цясляр,— смяецца з ката Муха,— яны аднаго твайго выгляду, мурзаты качагар, палохаюцца.

Праўда, два шпакі прыляцелі, пакружылі над клёнам і чамусьці селі на плот проста пад вокнамі.

— Штосьці ў цябе не атрымалася,— расхвалявалася бабуля Міла.

— Гэта каб у мяне ды не атрымалася! Ды я майстра на ўсе рукі,— выхваляўся Фокус,— усё па чарцяжах рабіў! — Але таемна ад гаспадыні ўсё ж вырашыў патэлефанаваць Агапцы.

Папрасіў у старога мастака мабільнік і датэлефанаваўся да сваёй сяброўкі.

Агапка папрасіла сфатаграфаваць шпакоўню і даслаць праз камп'ютар фотаздымак. Фокус гэта вельмі хутка зрабіў. Атрымала фотаздымак Агапка і адразу ўсё зразумела.

Барабанадуля хоць і зрабіў чарцёж шпакоўні, але вырашыў пасмяяцца з Фокуса і трохі схітраваў.

Шпакоўня на чарцяжы была без акенца-дзверцаў, праз якое шпакі залятаюць і вылятаюць.

Трэба было спяшацца. І Агапка ў першы ж дзень вясновых канікул паехала з бацькамі ў Крынічкі. Яны паспелі. Пара шпакоў усё яшчэ

кружылася над клёнам, надта ж ім спадабалася бабуля Міла, гарод, сад, дом суседа-мастака, лугавіна за вёскай.

Агапка і Фокус прынеслі шпакоўню дзядулю-мастаку, які прасвідраваў у ёй акенца. І як толькі прымацавалі шпакоўню да клёна, у ёй пасялілася пара шпакоў, якія цярпліва чакалі, седзячы на плоце.

Шпакі нават заспявалі з радасці. Толькі Муха не радавалася. Не змагла яна падмануць Фокуса і нашкодзіць кату. Улетку шпакі спявалі на ўсе лады, ім падпявалі, седзячы на правадах, ластаўкі, дразды, быў чуваць цудоўны голас авяльгі, а позна ўвечары свой канцэрт наладжвалі салаўі, якія жылі ў суседнім закінутым садзе.

Наляцеў аднойчы на вёску такі страшны ўраган, якога і бабуля Міла не памятала. Агапка, якая затрымалася ў гасцях у Фокуса, не рызыкнула нават бегчы дадому. Вырашыла перачакаць, седзячы з Фокусам ля акна. У Фокуса слых выдатны. Нават праз дождж пачуў ён плач яблынькі з суседняга закінутага саду.

— Табе падалося. Гэта вецер у коміне вые, а не плач зусім,— супакоіла яго Агапка.

— Плача. Павер мне,— пераконваў Агапку Фокус.

— Добра. Бяры парасон, хадзем правяраць.

— Ага. Каб мяне знесла ў якую Інданезію? — захваляваўся Фокус.

— Тады пабеглі проста так. Дождж быццам бы ўжо і не такі моцны,— сказала Агапка, і яны пабеглі ў сад.

І сапраўды. Яны пачулі енкі і плач яблынькі. На ёй было надта багата яблыкаў, і адна найвялікшая галіна ўжо не вытрымлівала пад ветрам і дажджом цяжару пладоў, хілілася да зямлі.

Агапка адразу зразумела, што трэба рабіць. Яны пабеглі да дома старога мастака, узялі драбіны і разам з бабуляй Міляй і Агапчынай бабуляй з цяжкасцю, але змаглі падперці драбінамі абцяжараную яблыкамі галіну. Бацька Агапкі, які прыехаў на выходныя дні ў вёску, ухваліў за знаходлівасць сваю дачку і Фокуса, панасек падпорак-рагацін і ўмацаваў імі замест драбін галіны старой яблыні.

Так і жылі ў Крынічках сябры, з радасцю сустракалі штораніцы сонейка. А неўзабаве праводзілі ў вырай шпакоў, ластавак, авяльгу,

салаўя... толькі спеў-гудзенне Мухі на ўсю вёску і застаўся. Паехала ў горад і Агапка, пачаўся новы навучальны год.

Зусім адны засталіся бабуля Міла і кот Фокус. І тут здарылася зусім неверагоднае. Не пусціў да сябе ў дом на зіму Муху Ракету Барабанадуля. Засталася яна з дзецьмі на вуліцы і вельмі спалохалася. Што рабіць? Паляцела ў разведку да хаты Фокуса, які адразу ж заўважыў яе і пачаў палохаць: схапіў мухабойку і пагрозліва прыстрашыў. Зусім спалохалася Муха, паляцела. Пра свой смелы ўчынак Фокус расказаў гаспадыні.

Зазлавала бабуля Міла.

— Гэта яна... муха... сабе на зіму месца шукае. Яны ж у вырай не адлятаюць.

— Хай да Барабанадулі ідзе,— адказаў Фокус.

— Відаць, не пускае яе да сябе сусед. Шкада,— сумна сказала бабуля Міла.

— Я што. Я нічога. Я так. Яна мяне кусала калісьці,— апраўдваўся Фокус.

— Ты вось што... Выкінь мухабойку на сметніцу...

— Э... як гэта...

— Я сказала, выкідай,— строга паўтарыла бабуля,— і не палохай яе больш. Хай заляціць у хату і месца сабе на зіму знойдзе.

— Як загадаеце,— пагадзіўся Фокус і выкінуў мухабойку.

Усё гэта бачыла асцярожная Муха, праляцаючы міма Фокуса ў хату.

— Знайшла сабе месца? — спытала бабуля.

— Дзякуй. Знайшла, калі вы не супраць... за печкай... мы будзем спаць... гудзеннем трывожыць не будзем... мы пяць месяцаў спім.

— Хто гэта «мы»? — пацікавіўся Фокус.

— Мы... Я і чацвёра маіх дзетак. Яны яшчэ зусім маленькія. Яны надта змерзлі — лапкі ўжо халодныя. Яны сядзяць у шпакоўні. Калі вы не супраць,— адказала Муха.

— Безумоўна, не супраць,— з усмешкай адказала бабуля Міла.

— Я што... я нічога. Я таксама не супраць,— адказаў і Фокус.

— Ну вось вы і пamірыліся. І дзякуй богу. Гэта так добра — сябраваць, жыць у міры,— ухваліла іх бабуля Міла.

Неўзабаве ўся сям'я Мухі разам з Фокусам піла малачко. Цяпер зімы яны не баяліся.

— А то,— сказаў Фокус, аблізваючы свае вусы,— і Агапка нас ухваліла б, у яе добрае сэрца. Праўда, бабуля Міла?

— Праўда,— пасміхаючыся, адказала гаспадыня.



## ЯК РАТАВАЛІ ФОКУСА

Суровая надышла зіма. Прыціснулі маразы. Нават каўкі і вароны схаваліся на гарышчы, не прыляталі ў двор Фокуса па ежу. Толькі сінічкі імгненна з'ядалі сланечнікавае зерне, якім іх штораніцу частавала бабуля Міла. Снега насыпала па самыя вокны. Сквапны Піліп Барабанадуля на сваім міні-трактары расчысціў ад снегу вуліцу толькі да свайго дома.

— А далей? А да нас? — папрасіў кот Фокус.

— Грошы гані. Паліва дарагое,— адказаў за свайго гаспадара сабака Пірат.

Тут чорт падаткнуў Фокуса, і кот пахваліўся:

— Затое нам і Агапчыным дзядулю з бабуляй раённыя ўлады падаравалі плазменныя тэлевізары, во-о-сь з такім экранам, на палавіну сцяны.

— І за што гэта толькі вам дзяржава гэткія дарагія падарункі робіць? — здзівіўся Барабанадуля.

— А за тое, што мы падзялілі першае месца па культуры свайго двара. Конкурс быў. У нас і вяргіні, і лілеі ля ганка, і калодзеж размаляваны, і астры пад акном, і настуркі, і турэцкі боб,— з гонарам адказаў Фокус.

Вельмі пазайздросцілі гэтаму падарунку Пірат і яго гаспадар.

Даляцеў у разгар зімы, якраз перад Калядамі, да вёскі Крынічкі нейкі злы заморскі вірус, прынёс грып. Цяжка захварэла бабуля Міла, як мог дапамагаў ёй Фокус, ды хвароба не адпускала, і тады выклікаў кот хуткую дапамогу і павезлі бабулю Мілу ў бальніцу — ратаваць. Фокус застаўся адзін у хаце. Тут і надумалі здзейсніць сваю чорную справу Барабанадуля і сабака Пірат. А ўсё ад зайздрасці.

Паведамілі ў санэпідстанцыю, што жыве ў іхняй вёсцы нейкі бяздомны, брыдкі, заразны кот. Трэба было б яго злавіць і аддаць у гадавальнік для бяздомных і адзінокіх жывёлін. Маўляў, баімся хваробу якую ад яго падчапіць.



Служба сваю справу добра ведае. Як атрымалі ліст, дык наступным днём адразу і прыехалі. Барабанадуля дзеля гэтага нават дарогу да дома Фокуса пачысціў сваім трактарам.

Убачыў кот праз акно двух дужых санітараў у белых халатах з вялікімі сачкамі ў руках і здагадаўся, што не з добрымі намерамі яны да яго з'явіліся. Зачыніў дзверы на засаўку. Агапка ў гэты самы час паснедала і вырашыла пачаставаць смачнымі сырнікамі Фокуса. Як жа яна здзівілася, калі ўбачыла на ганку двух незнаёмцаў.

— Адчыняйце дзверы! Інакш нам давядзецца ўжыць сілу,— пагрозліва папярэдзіў адзін з санітараў.

— А што здарылася? — пацікавілася дзяўчынка.

— Паступіла інфармацыя ад суседзяў, што ў гэтым доме хаваецца бяздомны кот на мянушку Фокус, прыдумаў жа сабе мянушку... разносчык хвароб... мы абавязаны яго злавіць ды ізаляваць ад здаровых людзей,— строга сказаў другі санітар.

— Ён не бяздомны. У яго ёсць гаспадыня,— заступілася Агапка.

— І дзе ж яна?

— У бальніцы.

— Ха! А можа, у тэатры ў балеце танцуе? На гэты момант нікога няма. Мы дзейнічаем адпаведна інструкцыі. Суседзі паскардзіліся. Адчыняйце зараз жа дзверы! — запатрабаваў першы санітар.

Зразумела Агапка, што санітараў не перакананацць, не дамовіцца з імі. Пабегла яна ў свой дом, схапіла сарафанчык з хустачкай, якія бабуля пашыла для балонкі, і вярнулася да Фокусавага дома. Санітары не ведалі, што ў доме на верандзе ёсць яшчэ дзверы, якія вядуць у сад.

Фокус як убачыў Агапку, дык адразу акрыяў.

— Хуценька нацягвай вось гэта.

— А што гэта?

— Камбінезон. Не губляй часу, хутчэй.

— Гэта ж сукенка,— запярэчыў Фокус.— Не! Ніколі! Калі дазнаецца пра гэта дзядзька Фокус-Мокус Фрыдрых Фердынанд І, а ён у Еўрасаюзе жыве, на смех падніме. Не дасць мне шэнгенскай візы.

— Надзявай, калі жыць хочаш.

— Жыць хачу,— адказаў Фокус і з Агапчынай дапамогай надзеў сарафанчык. Дзяўчынка завязала яму на галаву і хустачку.

Санітары ўсё стукалі ў дзверы сваімі моцнымі кулакамі.

— Дзе ў вас дамавая кніга? — хуценька спытала Агапка.

— У шафе, на верхняй паліцы.

Агапка выцягнула дамавую кнігу і ўпісала ў яе нейкае слова.

— Чакаем адну хвіліну. Калі не адчыніце, мы ўзламаем дзверы! — страшыў адзін з санітараў.

Агапка, захоўваючы спакой, адчыніла дзверы.

Санітары не ўвайшлі, а ўварваліся ў дом. Пры стале сядзеў Фокус і разглядаў малюнкі ў кніжцы.

— Вось ён! — паказаў на Фокуса адзін санітар.

— Вашу дамавую кнігу! — запатрабаваў другі.

— Дзе ў нас дамавая кніга? — спытала ката Агапка.

— У шафе, на верхняй паліцы.

Агапка працягнула дамавую кнігу санітарам.

— Та-ак. Тут жывуць... бабуля Міла... а дзе Фокус?

— Я Фокус.

— Што і трэба было даказаць! — спакойна сказаў адзін з санітараў.— Збірайся, мурзаты

беспрытульнік, пакуль не позна, а то давядзецца ўжываць сілу.

Кінуўся быў Фокус у адчыненыя дзверы, ды другі санітар адштурхнуў яго ботам на месца.

— І праўда, нейкі шалёны! — здзівіўся санітар.

— Гэта Фокус, але не той Фокус,— сказала Агапка,— вы прачытайце, у дамавой кнізе напісана.

Санітар зноў разгарнуў дамавую кнігу.

— Тут жывуць... Бабуля Міла і Ангора Фокус.

— Вось,— пачала Агапка,— Ангора... Яе першае імя. А Фокус — гэта так, мянушка. Гэта кошачка, а не кот... Ангора. Ён, яна, яно. Яна — кошачка Ангора. Жаночы род. Дык вось жа і сарафанчык новы толькі прыдбалі. Гэта мая кошачка. Вы яе напалохалі, і яна схавалася ў доме. А той Фокус тут даўно і не жыве.

— Так, падобна на тое... Прыгожы сарафанчык. А чаго гэта ён — ці яна — збегчы надумалася? — узяло сумненне санітара.

— Дык спалохалася. Выгляд у вас страшны.

Падумаў, падумаў санітар і адказаў:

— Добра. Па дакументах усё супадае. Фокус-Ангора ці Ангора-Фокус. Памылачка здарылася. Прабачце.

І яны паехалі ні з чым.

— А што такое Ангора? — пацікавіўся Фокус.

— Парода такая. Турэцкая,— адказала Агапка.

І гэтым разам не змог Барабанадуля зрабіць паскудства.

Фокус вырашыў на ўсялякі выпадак сарафанчык не здымаць. Выйшаў на вуліцу, а насустрач Барабанадуля і Пірат. Убачылі яго ў дзіўнай вопратцы і паднялі на смех.

— Гэй, клоўн. А ну давай выканай нам «Цыганачку». Вочы чорныя, вочы цудныя, гэх, раз...— блазнуе Пірат.

— Смяецца той, хто смяецца апошнім,— адказаў Фокус, прыгадваючы любімую прыказку сваёй гаспадыні.

Скончыліся канікулы. Пасля Раства, якое сустрэлі ля навагодняй ялінкі ў доме Агапкі, дзяўчынка паехала ў сталіцу. А тут бабуля Міла вярнулася з бальніцы. Паздаравела, падужэла і нават памаладзела.

Убачыла Фокуса ў дзіўнай вопратцы з хусткай на галаве і здзівілася:

— Куды гэта ты сабраўся? На конкурс прыгажосці?

— Ды не. Гэта фокус у Фокуса,— адказаў кот і расказаў бабулі Міле пра тое, што адбылося пад Новы год.

Спачатку гаспадыня вельмі засмуцілася, але пасля павесялела і ўхваліла свайго ката, а яшчэ больш Агапку.

— Вось што. Каб надалей не было панадна нікому цябе палохаць, я выпішу і табе пашпарт. Будзеш афіцыйна гаспадаром двара, гарода, саду, адрыны і ўсяго скарбу,— сказала бабуля.

— Згодны,— узрадаваўся Фокус.

Бабуля Міла дапамагла яму зняць сарафан балонкі. І пачалі яны, як і раней, жыць у згодзе, дабро нажываць.

Тут і казцы канец. Фокус наш малайчына, і Агапка не памылілася, калі яго ратавала.

Усё.



## ЛІСА-РЫБАЧКА

Як вядома, ліса — звер хітры. Умее прыкінуцца кволай і хворай, скрасці тое, што ёй да смаку. Звычайна ходзіць пажывіцца ў вёску. Гэтым разам ёй не пашанцавала, але паспела скрасці ў аднаго гаспадара вуду. Бачыла аднойчы, як чалавек спрытна цягаў вудай з рэчкі рыбу. Чутка, што ліса мае прыладу для лоўлі рыбы, хутка абляцела ўвесь лес. Лясныя жыхары адразу захацелі стаць сябрамі лісы, і яна гэта зразумела.

— Пажыві ў маім гушчары,— запрасіў яе лось.— Бараніць цябе буду, а ты рыбу лаві.

— А што, рыба цяпер дорага каштуе. Прададзім рыбу ды купім табе сена,— згадзілася ліса.

Дзень жыве ліса ў лася, другі, трэці. Толькі адпачывае, да рэчкі ісці не хоча.

Аднойчы кажа яна ласю:

— Ідзі і прадай свае рогі, купі мне ў краме курку. Падсілкавацца трэба, раптам будзе вялікая рыбіна? Трэба, каб былі сілы выцягнуць.

Згадзіўся лось. Прадаў свае рогі і купіў курку. З'ела ліса курку і зноў легла на сена адпачываць.

— Досыць лынды біць, хадзем на рэчку,— настойліва сказаў лось.

Ліса нехаця, але ж пайшла. Закінула вуду ў раку. Сядзяць на беразе, чакаюць. Гадзіну, дзве, тры,— не бярэ рыба.

— На гэтым беразе ў рацэ няма рыбы,— пачала хітраваць ліса.

Вярнуліся дахаты. Стомленая ліса легла спаць. Раніцай прачнулася ды кажа ласю:

— Прадай, лось, свой компас ды купі мне курку. Заўтра будзе сонечны дзень, дык наловім рыбы.

Падумаў-падумаў лось і кажа:

— Не, компас прадаваць не буду. Я па ім дарогу вызначаю да свайго гушчара.

— Ах так! — занервавалася ліса.— Тады бывай! З твайго берага рыба не ловіцца.

Пайшла ліса ад ладся. Ідзе з вудаю па лесе, а насустрач ёй воўк.

— Кажуць, у цябе, рыжая, цуда-вуда ёсць. Наловіш рыбы, пабагацееш...

— Так, праўда,— адказала ліса,— але няма дзе прытуліцца. Ночы не сплю, каб хто вуду не скраў.

— Гэта паправім. Хадзі да мяне ў логава. Будзем жыць разам,— прапанаваў воўк.— У мяне ёсць мікрахвалёўка. Рыбу будзем смажыць, смаката...

— Згодна,— радасна адказала ліса.

Жыве ліса ў ваўка дзень, другі, трэці.

— Навошта нам твая печка, за электрычнасць шмат плаціць трэба. Прадай яе, купі мне курку, падсілкавацца трэба. А заўтра наловім рыбы, падсмажым на сонейку,— прапанавала ліса.

Згадзіўся воўк. Вельмі яму хацелася рыбкі пакаштаваць. Прадаў печку, купіў курку. З'ела ліса курку і легла адпачываць. Дзень адпачывае, другі, каб сіл набрацца.

— Хадзем, кума, да ракі. Рыбы хачу,— сказаў воўк.

Пайшлі яны да ракі. Закінула вуду ліса ў ваду. Сядзяць, чакаюць. Гадзіну, дзве, тры. Не бярэ. Паплавок нерухома ляжыць на вадзе.

— Не шанцуе нам. Няма на тваім беразе ракі рыбы. Ламачча ды кусты. Яшчэ лёску парву.

Ды і сумна ў цябе ў логаве. Пайду да мядзведзя, у яго тэлевізар ёсць,— сказала ліса і хуценька пабегла прэч ад ваўка.

Ідзе яна па лясной сцежцы, а насустрач ёй мядзведзь.

— Я цябе шукаў, ліса.

— Слухай, мілы, маю я чарадзейную вуду, ды няма дзе жыць. Начыма не сплю, вартую вуду, каб не скралі,— кажа яму жаласным галаском ліса.

— Хадзем да мяне. Рэчка побач. Надакучыла мне аднаму жыць, цяжка ўжо лапамі рыбу лавіць.

Згадзілася ліса. Пайшла да мядзведзя жыць. Дзень жыве, другі, трэці.

— У цябе добра. Тэлевізар ёсць, мабільны тэлефон. Ляжы сабе ды глядзі серыялы, як людзі жывуць.

— Яно так, але есці хочацца. Тэлевізар не корміць.

— Паправім справу,— ажывілася ліса.— Прадай мабільны тэлефон, купі нам курак... Пакуль ідуць дажджы, рыба не бярэ, трэба перачакаць...

Паслухаў яе мядзведзь, прадаў тэлефон, купіў курак. Жывуць — гора не ведаюць — тыдзень, другі. Урэшце мядзведзь кажа:

— Хадзем, рыжая, да рэчкі. Рыбы хачу.

Пайшлі. Закінула ліса вуду. Гадзіну чакаюць, другую, трэцюю. Не бярэ.

— Ды што такое? — дзівіцца мядзведзь.— Тут рыбы заўсёды шмат было.

— Няма. Было ды сплыло. Не рыбнае месца,— адказвае яму ліса.— Прадай тэлевізар, купі курак...

— Не, не буду прадаваць,— з сумам сказаў мядзведзь.

— Тады бывай здароў,— адказала ліса і хуценька падалася ў лес.

Надакучыла ёй несці вуду, кінула яе на дарозе. Тым часам ехаў на матацыкле вясковец, у якога ліса гэтую ж вуду і скрала. Падняў ён вуду, абрадаваўся, што знайшлася.

Сядзяць на беразе ракі лось, воўк і мядзведзь ды сумуюць. Хацелі рыбы паесці ды не атрымалася.

Падплывае да іх выдра і пытае:

— Чаго такія сумныя?

Расказалі ёй лясныя жыхары пра рыбалку з лісой. Усміхнулася выдра і кажа:

— Я думаю, што гэта ліса пераходзіць з вудаю з аднаго месца на другое. Падплыла я бліжэй і здзівілася: кручок у вуды голы. Каб налавіць рыбы, трэба на кручок нанізаць прынанку: чарвяка, ці гарох, ці хлеб. Хіба ж не ведалі?

— Не, не ведалі,— разам адказалі звяры.

— А ў каго яна пазычыла вуду, хіба гаспадар не падказаў, што і як рабіць?

— Не пазычала яна, а скрала,— адказаў лось.

— Ліса ўмее красці,— дадаў воўк.

— Толькі лавіць рыбу не ўмее,— уставіў сваё слова мядзведзь.

— Усё зразумела, сябры мае дарагія,— сказала выдра.— Як вучыла мяне маці, скрадзенае нікому і ніколі шчасце не прыносіць.

Да яе слоў і дадаць больш няма чаго.

## ТРЫ СІНІЧКІ

Жылі-былі ў вялікім горадзе тры сінічкі: мама і яе дзве дачушкі — старэйшая і малодшая. Улетку яны гора і бяды не ведалі. Усяго хапала: ежы, цяпла і радасці ад сонечных дзён.

Надышла восень. Пачаліся дажджы, усё часцей дзьмуў халодны вецер. Мама-сінічка ведала, што з прыходам восені бабуля Варвара, якая жыла адна ў кватэры на шостым паверсе шматпавярховага дома, будзе сыпаць семечкі сланечніка на казырок акна. І сінічкі будуць іх дзяўбці ўсю восень і зіму.

Бабуля Варвара хаця і была на пенсіі, але яшчэ працавала ў гардэробе паліклінікі, што размяшчалася па суседстве з яе домам. Жанчына шкадавала ўсіх птушак, якія зімавалі ў двары дома: вараб'ёў, кавак, варон, галубоў, а найбольш шкадавала сінічак з танюткімі лапкамі.

Яна ўсё здзіўлялася: як ім не холадна ў зімовыя маразы?

Бабуля Варвара семечкі сыпала раніцай і вечарам. Маці-сінічка ведала, дзе знаходзіцца акно бабулінай кватэры, і паказала яго сваім дзеткам. Сінічкі былі ўдзячны жанчыне за яе дабрыню і клопат.

Здаралася, бабуля не паспявала своечасова насыпаць семечак, тады сінічкі садзіліся на казырок, зазіралі ў акно і падавалі сігнал: «Ціўціў, ціў-ціў». Вельмі кароткая ў іх песня, але гучная, добра чуваць нават стоячы ў кухні. Бабуля Варвара, пачуўшы іх песню, спяшалася пачаставаць сваіх гасцей.

Так і жылі.

Выпаў снег. Пачаліся першыя маразы. Цемра надыходзіла хутка. Сінічкі снедалі позна, абедалі і вячэралі адначасова.

Аднойчы надумала меншая сінічка перахітрыць сваю маму і сястру.

І што ж яна вырашыла зрабіць? А вось што... Прачнуцца раней за маці і сястру і ранкам, калі яшчэ амаль цёмна, прыляцець да знаёмага акна і папрасіць бабулю накарміць яе на ўвесь дзень, каб пасля спаць аж да новага дня. Так

і зрабіла. Пакуль маці і сястра спалі, яна падхапілася і — куляй да знаёмага акна, наелася і хутка назад. Па нейкім часе паляцелі да акна маці і сястра, ды ні з чым вярнуліся, галодныя. Усё здзяўбла малодшая.

Раніцай наступнага дня першая да акна прыляцела малодшая. Аднак семечак не было: бабуля прыйшла позна ўвечары дадому і таму яшчэ спала.

Маленькая сінічка села на казырок, зазірнула ў акно і давай на ўвесь голас ціўкаць, будзіць бабулю, пастукваючы дзюбай у шкло.

Прачнулася бабуля з галаўным болем і, незадаволеная, выйшла на балкон. Пасварылася на сінічку. Тая спужалася і паляцела дадому. Прыляцела ў старую шпакоўню і схавалася пад цёплае крыло маці.

Добра развіднела, маці пачала будзіць сваіх дзетак:

— Час ляцець снедаць да бабулі.

— Я не палячу,— адказала малодшая.— Нешта мне не хочацца есці.

Паляцелі дзве старэйшыя сінічкі. Прыляцелі да акна, а семечак і няма.

Вярнуліся яны галодныя.

Наступнай раніцай збіраюцца ляцець на снеданне, і зноў малодшая адмаўляецца ляцець з імі. Паляцелі ўдзвюх, паснедалі і вярнуліся.

На трэці дзень маці пытае ў малодшай дачкі:

— Чаму не ляціш разам з намі? Калі не будзеш есці, захварэеш і памрэш.

Тады малодшай нічога не заставалася, як прызнацца:

— Мне сорамна, я баюся, што бабуля Варвара будзе сварыцца на мяне...

Пасаромілі маці і сястра малодшую, але ж даравалі ёй. З апошніх сіл даляцела да акна сінічка з дапамогай маці і сястры. Было вельмі холадна, але птушкі сядзелі моўчкі, чакалі. А бабуля Варвара, хаця і хварэла, апранула футра і насыпала сваім дарагім гасцям пачастунак.

Малодшая сінічка апусціла галаву, каб не сустракацца вачыма з бабуляй. Ёй было вельмі сорамна. А жанчына была рада ўбачыць сваіх знаёмых сінічак.

— Частуйцеся, частуйцеся на здароўе, мае дарагія сяброўачкі,— прыгаворвала бабуля.

Паелі сінічкі і сваёй песняй падзякавалі бабулі, а больш за ўсіх спявала малодшая сінічка.



Яна зразумела, што падманваць — гэта кепска, а жыць за чужы кошт — ганебна. І дала сама сабе слова — болей не хітраваць.



## БЯДА, ГОРА І СІЛА ВОЛІ

Аднойчы вось што здарылася ў маленькай вёсцы на Палессі.

Вёсачка гэтая з дваццаці хат, у іх жывуць старыя людзі, дзеці і ўнукі якіх жывуць у розных гарадах і наведваюць дзядулек і бабулек звычайна толькі ўлетку.

Да дзеда Тараса, яго хата тулілася да самага лесу, пакуль ніхто не прыехаў. А на дварэ быў ужо ліпень, сярэдзіна лета.

Дзед Тарас чакаў свайго любімага ўнука Ціmoxу, кадэта са слаўнага Полацка. Прадчуваючы нешта нядобрае, стары хваляваўся за ўнука.

На Палессі часта здараецца, што раніцай цёпла свеціць сонейка, а бліжэй да абеду — прынясе моцны вецер чорную хмару з грымотамі і дажджом.

Так і цяпер здарылася. Завісла над вёскай, як крыло чорнага крумкача, хмара. Дождж ліў

як з вядра, неба не было відаць. Вецер з каранямі выдзіраў з зямлі старыя дрэвы.

Дзед Тарас ледзь паспеў схавацца ў хату ад непагадзі. Такой жахлівай навальніцы ён за ўсё жыццё ні разу не бачыў. За акном нешта зарыпела, дзед зірнуў на вуліцу. Убачыў, як вецер падняў ліст шыферу з Тарасавай хаты і панёс яго да лесу.

Бура панавала паўгадзіны. Трохі стала цішэй. Чорная хмара павісла над лесам, палохаючы лясных жыхароў маланкамі.

Дзед выйшаў на двор. Са сваёй будкі насустрач выбег сабака Ваўкадаў. Дзед ласкава пагладзіў ахоўніка між вушэй. Ад сапраўднага ваўкадава ў сабакі была толькі мянушка, а сам ён — маленькі, на кароценькіх лапках, падобны на таксу. Ваўкадаў і ваўка ніколі ў жыцці не бачыў.

Тарас агледзеў двор: дах дзіравы, плот павалены, куратнік разбураны.

— От нарабіла бура бяды,— з сумам сказаў дзед.

Толькі ён прамовіў гэтыя словы — і каля яго, як з-пад зямлі, вырасла Бяда.

— Вой, гора ад гэтай бяды,— зноў уголас сказаў дзед.

І раптам побач узнікла Гора.

Сеў дзед на зэдлік, абхапіў галаву рукамі. Прыслухаўся — нехта па хаце ходзіць...

— Хто тут? — спытаў Тарас.

— Гэта я, Бяда.

— Не чакаў цябе. Сама прыйшла.

— Дзівак-чалавек. Мяне ніхто не чакае, я сама прыходжу. Люблю ўладарыць над людзьмі,— з гонарам адказала Бяда.— Добра тут у цябе. Свежае паветра. Дождж праз дзірку хату залівае... Хораша-а-а. Мне падабаецца, пажыву ў цябе.

Не знайшоўся што сказаць Бядзе дзед. Рыпнулі дзверы. Прыслухаўся стары: зноў нехта ходзіць.

— А ты хто?

— Ты мяне сам паклікаў. Сеў і гаруеш. Вось кароўка твая недзе знікла. Я тваё Гора.— Гора агледзелася, убачыла Бяду.— Прывітанне, сястрычка. Хораша тут у вас, пажыву з вамі...

— Хутка ж ты мяне знайшло,— адказала Бяда.

— А мне без цябе сумна. Дзе ты, там і я...

— Добра, заставайся. Толькі я тут буду гаспадыняй, а ты мяне будзеш слухацца. Не будзе

Бяды — і Гора не будзе. А стары пакуль пад нашай уладай, мабыць, надоўга.

— Я згодна,— адказала Гора.

Дзед Тарас сядзіць у хаце ў адзіноце, а Бяда і Гора на двары грэюцца на сонейку ды спяваюць:

Не памогуць табе людзі,
Шчасця ў хаце больш не будзе.
Толькі будзеш бедаваць,
Гора мыкаць і стагнаць.

Вось у такім прыгнечаным стане і ўбачыў дзеда ўнук-кадэт Цімоха, прыехаўшы да старога на канікулы.

Цімоха з'явіўся перад Тарасам у прыгожай кадэцкай форме, у добрым настроі. Паглядзеў унук на старога, які сядзеў на ганку, і не пазнаў свайго вясёлага і актыўнага дзеда.

— Што здарылася, дзядуля? Чаго такі сумны, нібы і не рады мне,— спытаў унук.

— А чаму радавацца, Цімоха? Бяда і Гора прыжыліся ў маёй хаце.

Дзед Тарас расказаў унуку пра тое, што нарабіла бура.

— Не будзем сумаваць, дзядуля. Хіба ў нас няма сілы волі? Нас, кадэтаў, вучаць перадольваць усе непрыемнасці ў жыцці,— адказаў Цімоха.— А зараз, мой даражэнькі дзядуля, пойдзем пап'ем твайго фірмовага ліпавага чаю з малінавым джэмам. А за справу возьмемся пасля...

Прыгледзелася Бяда да жвавага хлопчыка і занепакоілася. Не спадабаўся ён Бядзе. Прыкмеціла Бяда, што побач з Цімохам яшчэ нехта ходзіць.

— А ты хто? — пацікавілася Бяда.

— Я — Сіла Волі, а Цімоха — мой найлепшы сябра,— адказала Сіла Волі.

— Паслухай, што я табе скажу, Сіла Волі. Гаспадары тут мы — я і Гора. Таму сядзі моўчкі і голасу не падавай, што мы загадаем, тое і рабіць будзеш. Зразумела? — зло прашыпела Бяда.

— Вось так...— падтрымала Гора сяброўку.

— Я не люблю, калі мной кіруюць,— адказала Сіла Волі.— І вам не дазволю гэта рабіць ні са мной, ні з маімі сябрамі.

— Яна адна, а мы ўдваіх,— шапатала Гора Бядзе,— нас ёй не пераадолець.

— Не падабаецца мне гэты кадэт,— хвалявалася Бяда.

Цімоха сеў на ровар, праехаўся па вёсцы, знайшоў шыферны ліст, які бура сарвала з даху.

— Дзед, трымай драбіну, будзем дах латаць,— крыкнуў унук старому.

Цімоха з дзедам Тарасам адрамантавалі дах, а ў гэты самы момант Бяда і Гора кепска сябе адчулі...

— Нешта ў мяне са здароўем зрабілася,— паскардзілася Бяда.

— І ў мяне таксама ўсё баліць,— адказала Гора.— А ты бачыш, як дзед павесялеў?

— Што нам цяпер рабіць? — спыталася Бяда.

— Вядома што: трэба тэлефанаваць Ветру. Хай прыгоніць яшчэ больш моцную буру, пакліча больш чорную хмару, каб усё тут разбурылі!

— У мяне няма сувязі, давай з твайго патэлефануем,— схітрыла Бяда.

— Трымай...

Бяда набрала нумар тэлефона Ветру, але той не адказваў.

— Тады пішы эсэмэску,— сказала Гора.

— Я не ўмею...

— Жах! Без цябе напішу,— Гора адправіла паведамленне Ветру: «Пан Вецер, я з сяброўкай у небяспецы. Трэба твая дапамога. Вёска Колкі, хата дзеда Тараса. Чакаем. Твае сяброўкі».

А Цімоха з дзедам адрамантавалі плот, замацавалі вароты і пайшлі ў лес шукаць дзедаву карову.

Унук параіў старому заставацца дома, бо ў дзеда балелі ногі, а раптам па лесе давядзецца доўга блукаць у пошуках каровы...

— Не, пойдзем разам. Кароўка мая адгукаецца толькі на мой голас,— адказаў дзед.

Гора і Бяда рушылі следам і шапталі дзеду на вуха: «Не хадзі, стары, у лес. Там гаспадарыць страшны шэры воўк!»

Але дзед ішоў за ўнукам і не слухаў іх.



Гора і Бяда забеглі наперад дзеда і Цімохі. Дайшлі да не надта шырокай і глыбокай рэчкі. Шыльду, на якой быў пазначаны брод, перанеслі ў месца, дзе было значна глыбей.

Дзед з унукам, не падазраючы падвоху, ступілі ў ваду, зрабілі некалькі крокаў і апынуліся па пояс у вадзе. Ваўкадаў паплыў да другога берага, дзед Тарас і Цімоха паплылі следам за сабакам.

Стары вылез на бераг, перавёў дыханне і пачаў клікаць кароўку:

— Пясчыначка! Пясчыначка!

Але знаёмага «му-у-у» ў адказ не пачуў.

З лесу насустрач дзеду і ўнуку выйшаў вялікі шэры Воўк. Стары такога вялізнага звера ніколі не бачыў.



— Што вы робіце ў маім лесе? — спытаў Воўк.

— Шукаем маю кароўку,— адказаў дзед.

— Якая ж яна твая? — нахабна спытаў Воўк.— Калі жывёла ў маім лесе, дык яна мая.

Цімоха зрабіў крок наперад і сказаў:

— Ты хочаш разысціся па-добраму?

— Ваўкі не разумеюць, што такое «па-добраму»...

Ваўкадаў вырашыў напужаць Ваўка і падскочыў да яго з выскаленай пашчай.

Воўк пасміхнуўся і ўдарыў Ваўкадава лапай па вуху, сабака заскуголіў і адбег ад ворага.

— Ну, хто яшчэ смелы?! Можа, ты? — торкнуў лапай у бок Цімохі Воўк.

— Ах ты, злыдня лясная, зараз я навучу цябе паважаць чалавека! — адказаў хлопчык.

Воўк не ведаў, што Цімоха быў чэмпіёнам па дзюдо ў сваім горадзе.

Воўк не паспеў апамятацца, як ляжаў, а Цімоха сядзеў на ім і прыціскаў да зямлі. Звер не мог нават паварушыцца.

— Дзе схаваў нашу кароўку? — спытаў дзед Тарас Ваўка.

Воўк зразумеў, што супраціўляцца няма чаго, і жалобна заскуголіў:

— Не забівайце мяне, людцы добрыя, усё раскажу. Прывязаў вашу кароўку да вялікай сасны каля балота. Памілуйце, я ж не ведаў, што яна ваша...

— Уставай,— сказаў Цімоха, адпускаючы звера.— Вядзі нас да Пясчыначкі.

Воўк прывёў дзеда Тараса і Цімоху да сасны. Пясчыначка, убачыўшы свайго гаспадара, замыкала ад радасці, што дзед прыйшоў яе выратаваць з палону.

Цімоха адпусціў Ваўка, і той пабег у глыб лесу — не азіраючыся.

На лясной сцяжынцы сустрэлі яго Бяда і Гора.

— Ты нам больш не сябра,— аслабелым голасам сказала яму Бяда.

— Адчапіцеся ад мяне. З вамі толькі звяжыся. Ледзь жывы застаўся,— адмахнуўся ад сябровак Воўк.

— Што будзем рабіць, Гора? Вецер нешта не адказвае. Моцы над дзедам Тарасам мы больш не маем. Пойдзем на сваё балота ды будзем чакаць, калі нас зноў паклічуць...

Дзед Тарас, Цімоха, Валкадаў і Пясчыначка вярнуліся дадому. Яны былі ўпэўнены, што Бяду і Гора можна перамагчы, калі ў цябе ёсць

Сіла Волі. Ішлі яны праз поле і весела спявалі, кожны па-свойму:

Хочуць Гора і Бяда
Нас пазбавіць шчасця.
Не панікні духам ты,
Сілу Волі кліч тады.

Вецер свішча, гром грыміць,
Хата, сена — ўсё гарыць.
Не панікні духам ты,
Сілу Волі кліч тады.

Сіла Волі, Праўда, Смеласць —
Тры надзейныя сястры.
Пераможаш з імі гора
І шчаслівы будзеш ты.

# ЗМЕСТ

Прыгоды ката Фокуса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Як Агапка мальву ўратавала . . . . . . . . . . . 4
Як кот Фокус ільвом быў . . . . . . . . . . . . . 12
Парада — добра, а свой розум — лепш . . . . 20
Як памірыліся Муха і Фокус . . . . . . . . . . . 27
Як ратавалі Фокуса . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Ліса-рыбачка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Тры сінічкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Бяда, Гора і Сіла Волі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60



**Марчук, Г. В.**

М30 Прыгоды ката Фокуса : казкі : для дзяцей малодшага школьнага ўзросту / Георгій Марчук ; іл. Віталя Дударэнкі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2022. – 71 с.

ISBN 978-985-02-1534-5.

Кот – найлепшы сябра і дзяўчынкі, і бабулі, і ўсіх добрых людзей. Асабліва калі гэта кот Фокус. Прыгодаў з ім мала не бывае: як ратавалі Фокуса, каго ратаваў сам Фокус, як ён быў ільвом. Казкі, з якімі цікава, казкі, якія робяць жыццё казачным,– для вас, дарагія чытачы.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-44**

Літаратурна-мастацкае выданне

**МАРЧУК** Георгій Васільевіч

**ПРЫГОДЫ КАТА ФОКУСА**

*Казкі*

Рэдактар *А. В. Малішэўская*
Мастацкі рэдактар *Н. В. Барай*
Тэхнічны рэдактар *Т. В. Свірыдзенка*
Стылістычны рэдактар *М. С. Неўгень*

6+

Падпісана да друку 10.01.2022. Фармат 70×100 $^1/_{16}$. Папера мелаваная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 5,85. Ул.-выд. арк. 2,35. Тыраж 1000 экз. Заказ 37.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/5 ад 09.07.2013. Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск. www.mastlit.by; e-mail: mail@mastlit.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.



ISBN 978-985-02-1534-5

Георгій Марчук